# Неўзабаве на старонках

**Лютаўскі нумар часопіса "Мастацтва" адкрываюць публікацыі пад сloганам "Зніч памяці", якія прадстаўляюць новыя творчыя задумы, прысвечаныя пакаленню герояў Вялікай Айчыннай.**

Аб праекце "Памяць", серыі графічных партрэтаў ветэранаў, распавядае аўтар Лізавета Пастушэнка. Аб адлюстраванні ваеннай тэмы на сцэне і тэндэнцыях сучаснага тэатральнага працэсу разважае мастацкі кіраўнік Драматычнага тэатра Беларускай арміі Арцём Пінчук.

Кітайскі Новы год даў нагоду для сустрэчы з творцамі, якія прыехалі з Паднябеснай і сталі сваімі для нашай культуры і мастацкай адукацыі. Гэта спявачка Чжу Гэлімэн — дацэнт БДУКМ, а таксама аспіранты Акадэміі мастацтваў жывапісец Чжан Юйнін і рэжысёр Ян Пэйхань. Яны любяць і родны Кітай, і гасцінную Беларусь.

Шэраг артыкулаў прысвечаны дэкаратыўна-прыкладному мастацтву. Слынны кераміст заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Аляксандра Дзятлава распавядае пра свае творы як пра істотныя этапы шляху і духоўнага станаўлення. Яе калега па кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і касцюма Хрысціна Высоцкая прэзентуе напрамкі развіцця адукацыі ў галіне мастацкага тэкстылю. Прадаўжае тэму артыкул Людмілы Вакар аб IX Рэспубліканскім біенале мастацкага тэкстылю. Дадатковы ракурс дае матэрыял пра выставу "За межамі бачнага" ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. У экспазіцыі прэзентаваны здабыткі Наталіі Цвятковай з Расіі, якая працуе ў кірунку fiber art.

Сярод падзей тэатральнага жыцця ўвагу нашых аглядальнікаў прыцягнула прэм'ера спектакля "Ацыс і Галатэя" ў Вялікім тэатры. Гэта знакаміты твор Георга Фрыдрыха Гендэля і першае ўвасабленне барочнай оперы не фрагментамі, а цалкам. А ў Акадэміі музыкі між тым прэзентавалі свае дэбютныя пастановачныя эксперыменты студэнты класа Ганны Маторнай — будучыя рэжысёры музычнага тэатра.

Дарэчы, дзякуючы мультымедыйным тэхналогіям прыгожыя мелодыі зноў гучаць і са старонак часопіса. Сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем і Рэспубліканскім музычным каледжам распачаты інтэрактыўны праект "Музыка жаночага хараства". Ён прысвечаны Году беларускай жанчыны і злучае візуальнае мастацтва з аўдыяльным, а традыцыйны фармат рэпрадукцыі — з сённяшняй інфасферай сацыяльных медыя. У музейнай зале, каля загадкавай карціны Івана Хруцкага "Партрэт невядомай з кветкамі і садавінай", іграе работа з цыкла Роберта Шумана "Дзіцячыя сцэны": два шэдэўры, жывапісны і музычны, былі створаны ў адзін год — 1838-ы. Кацярына Новікава, навучэнка РМК (клас Элеаноры Ахрэмчык), выканала побач са славутым партрэтам адну з самых пяшчотных шуманаўскіх п'ес — "Дзіця засынае". "Мастацтва" друкуе QR-код, які дасць чытачам доступ да відэа. Рамантычны матыў і вытанчанае жаночае хараство зачароўваюць з часоў Хруцкага і да нашых дзён...

